

МАПА ВУЛІЦЫ
КАСТРЫЧ-НІЦКАЯ
МЕНСК
34MAG.NET/POST/KASTRYCNICKAJA
ONE STREET MAP
KASTRYČ-NICKAJA
MINSK
Рака Свіслач
Svislač river
Веладарожка
Bikeway
Рэстарацыя «Я же тебе говорил!»
Restaurant "Ya zhe tebe govoril!.."
(Well I told you!..)
Гастраном
Grocer's
Сталовая
Canteen
вуліца ЛЕНІНА
LENINA street
Станцыя метро «ПЕРШАМАЙСКАЯ»
PIERŠAMAJSKAJA metro station
Станцыя метро «ПЕРШАМАЙСКАЯ»
PIERŠAMAJSKAJA metro station
вуліца КАСТРЫЧНІЦКАЯ
KASTRYČNICKAJA street
1 УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК БДУ
BELARUSIAN STATE UNIVERSITY CAMPUS
2 КЗ «МІНСК»
Канцэртная зала
MINSK CONCERT HALL
3 MZOR
EVENT SPACE | PR-KVADRAT | DIVA STUDIO
KITCHEN COFFEE ROASTERS | WHITE STAR | ULTRALAB
Крэатыўны хаб
MZOR / Creative hub
Сталовая
Canteen
4 ЗАВОД «КРЫШТАЛЬ», КРАМЫ «ДВА БУСЛЫ» І «КРЫШТАЛЬ»
KRYŠTAĽ PLANT / DVA BUSLY (TWO STORKS) AND KRYŠTAĽ (CRYSTAL) SHOPS
5 MOBY DICK
Трэнажорная зала
MOBY DICK GYM
6 СЦЯНА З ГРАФІЦІ
GRAFFITI WALL
Сцяна з графіці
Graffiti wall
7 ECLAB
Еўрапескі каледж
Liberal Arts у Беларусі
ECLAB / European College of Liberal Arts in Belarus
8 ENZO
Стэйкі і бургеры
ENZO / Steaks and burgers
ENZO
9 «ДЭПО»
Сідр і блінцы
DEPO / Cider and pancakes
10 «ЛАЎКА» І ДВОРЫК
Кава і сэндвічы
LAŬKA / Coffee and sandwiches
11 PLATFORMA
.PUNKT | GETBOB | PUBLIC GROUP | BIRDIE SHOP
Крэатыўны хаб
PLATFORMA / Creative hub
12 PAPERA PRESS
GIFTER, DONARIT
Запраўка
Gas station
Сцяна з графіці
Graffiti wall
13 «ХУЛИГАН»
Бар-клуб
HULIGAN BAR / Bar and club
14 «ЦЭХ»
Прастора і атмасфера
CECH / Space and atmosphere
15 YOGA PLACE
Студыя ёгі
YOGA PLACE / Yoga studio
16 ULTRA BAR
Хот-догі і піва
ULTRA BAR / Hot-dogs and beer
34MAG.NET
WWW.34MAG.NET/POST/KASTRYCNICKAJA

## 1 УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК БДУ

*(Кастрычніцкая, 2-12)* – круглагадовы «пастаўшчык» моладзі на вуліцы, у тым ліку і замежнай. Акрамя будынкаў інтэрнатаў у глыбіні квартала маецца ўніверсітэцкі стадыён і басейн (толькі для студэнтаў БДУ). Сярод карпусоў месцяцца дзве сталоўкі: танная прасторная *(Кастрычніцкая, 4)* і даражэйшая камерная *(Кастрычніцкая, 10)*. У фасадных будынках можна закупіцца ў гастраноме *(Кастрычніцкая, 6)* ці ў кітайскай крамцы *(Кастрычніцкая, 2)*.

**1/ BELARUSIAN STATE UNIVERSITY CAMPUS**
*(Kastryčnickaja, 2-12)* – year-round "provider" of youth, including foreign one, to the streets. Besides dormitory buildings, there is a university stadium and swimming pool (only for BSU students) in the blocks' depth. Among buildings you can find two canteens: cheap and spacious *(Kastryčnickaja, 4)*, and tiny and more expensive *(Kastryčnickaja, 6)*.
In front building it's possible to buy something at Grocer's *(Kastryčnickaja, 6)* or at Chinese shop *(Kastryčnickaja, 2)*.

## 2 КЗ «МІНСК»

*(Кастрычніцкая, 5)* – дзяржаўная канцэртная глыба з насычаным тэатральным і канцэртным рэпертуарам, таксама – база для беларускага КВЗ. З тыльнага боку будынка месціцца кніжны кірмаш «Ля спяваючых фантанаў», побач – караоке-клуб Burlesque. Вакол яшчэ тры рэстарацыі: савецкая класіка «Родны кут», загарадная рамантыка з шашлыкамі і альтанкамі ў «Трех мушкетерах» і месца пра ежу «Я ж тебе говорил!..» у аранжэрэі насупраць увахода ў КЗ.

**2/ MINSK CONCERT HALL**
*(Kastryčnickaja, 5)* – state monumental concert hall with eventful theatrical and concert repertoire, also is a base of Belarusian variant of stand-up comedy show KVN. At the building backside you can find the book-fair Lia Spiavajučych Fantanaŭ (Near Singing Fountains) and karaoke-club Burlesque. There are three restaurants around – classic soviet Rodny Kut (Native Land), rural romantic with barbecue and garden houses Tri Mushketera (Three Musketeers) and eating place Ya Zhe Tebe Govoril!..(Well, I Told You!...) in the orangery at the entrance to CH.

## 3 ХАБ MZOR

*(Кастрычніцкая, 16А)* аб'ядноўвае пад адным дахам арганізацыйную прастору для мерапрыемстваў Event Space, рэкламную агенцыю PRKvadrat, фотастудыі Diva Studio, White Star і «Фот.Граф» і каворкінг «Станкі і інструмент». Побач барысты-прафесіяналы з Kitchen Coffee Roasters забяспечваюць наваколле кавай. Акрамя працоўных будняў, тут перыядычна праходзяць прагляды кіно і спартовыя трансляцыі на свежым паветры, а таксама невялічкія «MZOR-пікнікі». Каб трапіць у лакацыю, трэба ля велапешаходных мастоў праз Свіслач павярнуць да сталоўкі і ісці далей за чорны плот.

**3/ MZOR HUB**
*(Kastryčnickaja, 16A)* brings together space for organizing events Event Space, advertising agency PRKvadrat, coworking Stanki i Instrument and photo-studios Diva Studio, Phot.Graph and White Star. Professional baristas from close Kitchen Coffee Roasters supply its neighborhood with coffee. Besides coming here to work people come to watch movies and sport translations, take part in MZOR-picnics, which time to time are held outdoors. To get to the place you need to turn to the canteen near bike and foot bridges and go further over the black fence.

## 4 ЗАВОД «КРЫШТАЛЬ» І КРАМЫ «ДВА БУСЛЫ» І «КРЫШТАЛЬ»

*(Кастрычніцкая, 15)* Шырокі выбар гарэлкі, він, бальзамаў, лікёраў. Ёсць на разліў партвейн, пасля якога не памятаеш сябе.

**4/ KRYŠTAĹ PLANT AND DVA BUSLY (TWO STORKS) AND KRYŠTAĹ (CRYSTAL) SHOPS**
*(Kastryčnickaja, 15)* There is large assortment of vodka, wine, balms, liqueurs. And you can also find port wine on tap, after drinking which you don't recognize yourself.

## 5 MOBY DICK

*(Кастрычніцкая, 16)* – трэнажорная зала ў лофт-стылі, створаная музыкамі з гуртоў BRUTTO, Morfe', «Егор Забелов трио» і H.A. Quartet. Таму фонам тут граюць адмысловыя падборкі для кача на густ заснавальнікаў. Кантынгент – ветлівыя дрышчы, якім няма ніякай справы да тваёй трапецыі. Таксама ёсць зала тайскага боксу, дзе трэніроўкі праводзіць той самы Гуркоў, а на першым паверсе адэпты слыннага кросфіту Dvor загоняць цябе ў самае пекла здаровага ладу жыцця.

**5/ MOBY DICK**
*(Kastryčnickaja, 16)* – loft-style gym created by musicians from BRUTTO, Morfe', Yegor Zabelov trio and H.A. Quartet bands. That's why music background for pumping muscles up consists of specific playlists according to the founders' taste. The contingent is polite weakly guys which don't care about your trapeze. There is also a Muay Thai boxing gym, where the Hurkoŭ conduct trainings. And on the first floor adherents of popular cross-fit from Dvor will drive you into the thick of a healthy lifestyle.

## 6 СЦЯНА З ГРАФІЦІ

*(Кастрычніцкая, 16)* – галоўны візуальны спот Кастрычніцкай, любімае места аматарскіх фотаздымак. Агромністыя, у чатыры паверха, муралы з'явіліся падчас беларуска-бразільскага фестывалю стрыт-арта Vulica Brasil. Зараз гэта выява гусляра з карагодам (Cowek), Фрыда Кало з ван Гогам і жырафамі (Rogerio Fernandes) і партрэт Чапскага (Izum).

**6/ GRAFFITI WALL**
*(Kastryčnickaja, 16)* – main visual spot of the street and favorite place for amateur photoshoots. It's huge, four-stored-height murals appeared during Belarusian-Brazilian street art festival Vulica Brasil. Now it's images of psaltery player with a round dance (Cowek), Frida Kahlo's with van Gogh and giraffes (Rogerio Fernandes) and a portrait of Čapski (Izum).

## 7 ECLAB

*(Кастрычніцкая, 19Б)* знаходзіцца ў схаваным ад вачэй утульным дворыку з сажалкай і ружамі паабапал. Акрамя рэлаксу тут можна атрымаць нефармальную адукацыю ад «Еўрапейскага каледжу Liberal Arts у Беларусі» (ECLAB), а таксама адвучыцца ў IT-школе Myfreedom.

**7/ ECLAB**
*(Kastryčnickaja, 19Б)* is situated in a cozy yard with pond and roses on both sides hidden from people's eyes.
You can not only relax here, but also get informal education from European College of Liberal Arts in Belarus (ECLAB) and study at IT-school MyFreedom.

## 8 9 10 ENZO, «ДЭПО», «ЛАЎКА»

*(Кастрычніцкая, 23)* – трохкутнае ядро грамадскага харчавання, галоўны пункт забеспячэння Кастрычніцкай правізіяй, у выпадку «Лаўкі» – у кругласутачным рэжыме. Раім заглянуць у ENZO за фірмовымі бургерамі, у «ДЭПО» – за сытнымі блінцамі з бутэлечкай айчыннага сідру, а ў «Лаўцы» сабраць сэндвіч з пажаданых інгрыдыентаў. Дарэчы, у гэтым жа будынку хаваецца канспіратыўны бар Stirlitz, а побач увечары на паркінг традыцыйна з'язджаюцца байкеры.

**8/ 9/ 10/ ENZO, DEPO, LAŬKA**
*(Kastryčnickaja, 2-12)* – public catering triangular core, the main place of providing Kastryčnickaja with food, in day-and-night schedule in Laŭka case. Highly recommend to look in ENZO (and take trademark burger), in DEPO for nourishing pancakes with a bottle of domestic cider and make your one sandwich with desirable ingredients in Laŭka. By the way, in the same building a conspirative Stirlitz bar hides, and the parking nearby is the spot for traditional bikers' hangouts.

## 11 PLATFORMA

*(Кастрычніцкая, 23А)* – раней гарбарня, а зараз крэатыўны хаб з офісамі рэкламных агенцый Public Group і GetBob, адукацыйнай прасторай .PUNKT і кветкавым салонам Birdie Shop.

**11/ PLATFORMA**
*(Kastryčnickaja, 23A)* – used to be a tannery and now it's a creative hub with Public Group and GetBob advertising agencies offices, educational space .PUNKT and flower saloon Birdie Shop.

## 12 DONARIT, PAPERA PRESS, GIFTER

*(Кастрычніцкая, 25)* У будынку побач з «Платформай» месціцца дызайн-студыя Gifter, майстэрня друку Papera Press і друкарня «Донарит».

**12/ DONARIT, PAPERA PRESS, GIFTER**
*(Kastryčnickaja, 25)* In the building near Platforma design-studio Gifter, printing houses Papera Press and Donarit are situated.

## 13 «ХУЛИГАН» 15 YOGA PLACE

*(Кастрычніцкая, 16)* – тусовачная мека Кастрычніцкай, а часам і ўсяго горада. Бар «Хулиган» штотыднёва збірае менскіх клабераў як унутры, так і на тэрасе, а летам наўпрост на вуліцы. А калі ты хочаш адпачыць ад культурнага калейдаскопу, заўсёды можна выбраць шлях цішыні ў ёга-студыі Yoga Place на трэцім паверсе.

**13/ HULIGAN BAR, 15/ YOGA PLACE**
*(Kastryčnickaja, 16)* – Kastryčnickaja and sometimes the whole city's rave Mecca. Every week Huligan bar gather Minsk clubbers inside and at the terrace as well, and outside in summer. If you want to have a rest from cultural "kaleidoscope", it's always possible to choose silence in Yoga Place studio on the third floor.

## 14 «ЦЭХ»

*(Кастрычніцкая, 16)* – флагманы сучаснага асветніцтва ў культурным асяродку Менску. Ва ўтульным памяшканні на другім паверсе «ЦЭХ» ладзіць выставы, адукацыйныя праекты, творчыя сустрэчы, лекцыі, а ўнізе, у ангары, якім ён карыстаецца разам з «Хуліганам», праходзяць буйныя фестывалі, кірмашы, месячнікі фота, а раз-пораз і тэхна-рэйвы. Карацей, жыццё вірue тут як нідзе.

**14/ CECH**
*(Kastryčnickaja, 16)* – leaders of modern education in cultural Minsk environment. Cozy space on the second floor is used for exhibitions, educational projects, creative meetings, lectures, and downstairs, in the hangar, (which is used also by Huligan) major festivals, fairs, Month of Photography, and sometimes techno-raves take place. In short, life is boiling here more than anywhere else.

## 16 ULTRA BAR

*(Кастрычніцкая, 16)* – новае месца на Кастрычніцкай, толькі пачынае ўставаць абеімі нагамі ў свядомасці заўсёднікаў вуліцы. Закусачная прапаноўвае хот-догі і бурыта ў старым завадскім лофце. Таксама ёсць піва.

**16/ ULTRA BAR**
*(Kastryčnickaja, 5)* – a new place at the street which now tries to get into regular habitués' minds. The snack-bar offers hot-dogs and burrito in old factory loft. Here you can also take a beer.

Болей пра гісторыю вуліцы і кропкі чытай на 34mag.
Там жа пампуй электронную версію мапы!

WWW.34MAG.NET/POST/KASTRYCNICKAJA

34 MAG. NET

